ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»

# Асвятленне парламенцкіх выбараў 2008 г. у беларускіх СМІ

Бюлетэнь №5

*(23 жніўня—5 верасня 2008 г.)*

Аналіз ахоплівае перыяд з 23 жніўня па 5 верасня г.г. Мэта – вызначыць, як беларускія медыя асвятляюць выбарчы працэс і дзейнасць тых суб’ектаў (як асобаў, так і структур), што ўдзельнічаюць у ім, а таксама наколькі апублікаваныя матэрыялы адпавядаюць прынцыпам журналісцкай этыкі і прафесійным стандартам журналісцкай працы падчас выбараў[1].

У аналізаваны перыяд камісіі рэгістравалі прэтэндэнтаў на дэпутацкі мандат, кандыдаты распачалі выбарчую агітацыю, выступы шэрагу кандыдатаў з’явіліся ў вызначаны ЦВК час ў дзяржаўных СМІ.

## Асноўныя вынікі і некаторыя высновы

Нягледзячы на тое, што выбарчая кампанія фармальна ўвайшла ў самую актыўную фазу, характар яе асвятлення ў дзяржаўных СМІ істотна не змяніўся. Яны па-ранейшаму акцэнтуюць сваю ўвагу на арганізацыі ды тэхнічных аспектах выбарчага працэсу (дзейнасці *ЦВК*), а не на агітацыйнай кампаніі. Сімптаматычна, што на зварот *Аб’яднаных дэмакратычных сіл (АДС*) аб правядзенні перадвыбарчых дэбатаў адказ кіраўніцтва дзяржрадыё быў адмоўны *(http://news.tut.by/politics/116046.html)*.

Неабходна яшчэ раз нагадаць, што выступы кандыдатаў па тэлебачанні ў Мінску і іншых вялікіх гарадах прыпадаюць на час з 17.30 да 18.30. Гэта азначае, што большасць працуючых выбарцаў, якія ў гэты час знаходзяцца па дарозе з працы альбо робяць закупы, не могуць з імі азнаёміцца. Істотным чынам абмяжоўваюць камунікацыю з выбарцамі і надзвычай малыя сродкі, выдаткаваныя кандыдатам на выраб агітацыйных матэрыялаў.

У сваю чаргу, спецыяльна прысвечаныя выбарам праграмы, што ўжо з’явіліся ў эфіры, не акцэнтуюць увагу тэлегледачоў на тым, што галоўны сэнс выбарчай кампаніі - выбар паміж рознымі праграмамі дзейнасці, палітычнымі платформамі ды рознымі сацыяльнымі і палітычнымі сцэнарамі развіцця беларускага грамадства, а не арганізацыйныя і тэхнічныя мерапрыемствы, якія, відавочна, мусяць ажыццяўляць ЦВК і мясцовыя ўлады. Так, передача *«От выборов до выборов» (Тэлеканал «Лад», ТРК г.Гомель)* працягласцю больш за паўгадзіны ўяўляе сабою вялікі рэпартаж пра адзін з раёнаў Гомельшчыны. Передача ад 26 жніўня 2008 г., напрыклад, прысвечана Лоеўскаму раёну. Вядучая ў прамым эфіры паведамляе: «*Включите громче динамики, жители Лоевского района… Вы увидите знакомые лица, улицы и дома – о вас, о вашей жизни*

---

[1] Аналіз БАЖ ахоплівае 20 сродкаў масавай інфармацыі, а менавіта: тэлевізійныя і радыёпраграмы *«Наши новости» (ОНТ), «Панорама недели» (Першы Нацыянальны канал БТ), «Навіны рэгіёна»* (Гомель), *«Новости-Регион» / ТРК «Магілёў», «Радыёфакт» (Першы нацыянальны канал беларускага радыё), «Навіны», Гомельскае абласное радыё (101.3 FM), «Навіны», абласное радыё ТРК «Магілёў»,* газеты *«Советская Белоруссия» («Беларусь сегодня»), «Рэспубліка», «Белорусы и рынок», «Народная воля», «Комсомольская правда» в Белоруссии»; «Брестский кур’ер», «Гомельская праўда», «Могилёвская правда», «Днепровская Неделя»,* інтэрнэт-рэсурсы www.belta.by, www.naviny.by, www.tut.by і інтэрнэт-версія *«Еўрапейскага радыё для Беларусь»”* www.euroradio.fm.

*сегодня в нашей программе. Если вы еще не все знаете о соседях, коллегах по работе, сейчас вы много о них узнаете*».

Пра выбары нагадвае толькі ролік «*От выборов до выборов*» (на пачатку, у сярэдзіне і напрыканцы праграмы). Вось тэкст роліка: *«От выборов до выборов. Четыре года созидательного труда. Рост благосостояния населения. Уверенный курс в будущее. Районы Гомельщины подводят итоги в утреннем эфире телеканала «Лад»*.

Перанясенне ўвагі тэлегледачоў з праблемы выбару (паміж рознымі палітычнымі і сацыяльнымі перспектывамі) на «мирный созидательный труд», на інтэрвію з мясцовымі кіраўнікамі, на дасягнутыя імі поспехі ёсць фактычна адным з прыёмаў праграмавання вынікаў галасавання на карысць толькі аднаго боку (кандыдатаў ад улады).

У дзяржаўных медыя па-ранейшаму дамінуе спрошчаная схема рэпрэзентацыі ўдзельнікаў выбарчага працэсу, калі галоўнымі дзеючымі асобамі застаюцца *Прэзідэнт і ЦВК*. На іх долю (параўнальна з іншымі суб'ектамі) прыпадае ад 60 да 99% плошчы і часу ў залежнасці ад сродку масавай інфармацыі (гл. адпаведныя графікі праграмы *«Радыёфакт» (Першы нацыянальны канал беларускага радыё), сайту БЕЛТА, праграмы ОНТ «Наши новости», газет «Рэспубліка»* і *«Советская Белоруссия» («Беларусь сегодня»).*

Як і ў папярэдні перыяд, дзяржаўныя медыя асвятлялі працу назіральнікаў ад СНД і заходніх назіральнікаў. На іх сукупна прыпадала ад 8 да 27% часу (гл: адпаведна графікі *«Наши новости» (ОНТ)* і *«Радыёфакт» (Першы нацыянальны канал беларускага радыё*).

Разам з тым, дзяржаўныя медыя яшчэ больш выразна акрэслілі сваё стаўленне да назіральнікаў. Надзвычай красамоўнымі з'яўляюцца тут артыкулы «*В своем глазу бревна не замечают?*» і «*Начните «демократию» с себя*» («*Гомельская праўда», 02.09.2008 і 04.09.2008*). Першы артыкул утрымлівае, напрыклад, такую выснову: «*Так что все замечания и предложения, сделанные в отчетах БДИПЧ ОБСЕ, - лишь очередной политический заказ по дискредитации нашего действующего избирательного законодательства. И объективного мониторинга нынешней важной для страны и нас, белорусских граждан, политической кампании ждать не приходится. До тех пор, пока ангажированные эксперты не прекратят использовать удобные для них двойные стандарты*». Абодва артыкулы падпісаны журналістам Аляксеем Нікалаенкам, прозвішча якога ў штаце газеты не значыцца. Факт выкарыстання псеўданіму яшчэ больш выразна паказвае на тое, што пазіцыя газеты з'яўляецца афіцыйна-прапагандысцкай (а канкрэтныя асобы, відаць, саромеюцца падпісаць матэрыял сваім прозвішчам).

Дзейнасць назіральнікаў ад СНД дзяржаўныя СМІ ацэньваюць пазітыўна (гл., напрыклад, графікі праграмы «*Наши новости*» *(ОНТ)* і праграмы *абласнога радыё ТРК «Магілёў»).* Тыя, у сваю чаргу, пазітыўна ацэньваюць дзейнасць ЦВК ды мясцовых уладаў па арганізацыі выбараў. Як заявіў С. Лебедзеў, кіраўнік місіі назіральнікаў СНД, «*идет плановая спокойная подготовка выборов в парламент Беларуси, и то, что мы сейчас видели, говорит о том, что местные власти и руководители избирательных комиссий ответственно подходят к избирательному процессу, делают все необходимое, чтобы выборы были демократичные, чтобы были учтены все пожелания наблюдателей, и чтобы были соблюдены права избирателей"(http://news.tut.by/politics/115729.html).*

Па-за дзейнасцю пяці названых суб'ектаў (*прэзідэнт, ЦВК, мясцовыя ўлады, назіральнікі ад СНД і заходнія назіральнікі)* вага астатніх удзельнікаў выбарчага працэсу ў дзяржаўных медыя блізкая да нуля. Напрыклад, ананімнай апазіцыі і ананімным

палітычным партыям праграма *«Наши новости» (ОНТ)* адвяла ўсяго 2,7% часу параўнальна з астатнімі суб'ектамі выбарчай кампаніі. А газеты *«Советская Белоруссия» («Беларусь сегодня»)* і *«Рэспубліка»* на гэты раз увогуле не заўважылі палітычныя партыі і не пісалі пра іх - ні пазітыўна, ні адмоўна.

Недзяржаўная прэса, асвятляючы дзейнасць ЦВК, непараўнальна болей пісала пра іншых суб'ектаў выбарчага працэсу. Тое ж тычыцца і недзяржаўных інтэрнет-рэсурсаў. Аднак, варта адзначыць, што аўдыторыя недзяржаўнай прэсы ў сотні разоў меншая за аўдыторыю дзяржаўных газет, гэтаксама як і аўдыторыя інтэрнет-рэсурсаў у параўнанні дзяржаўнымі электроннымі СМІ. Гэта азначае, што дзяржаўныя медыя фактычна вызначаюць фармат успрыняцця выбарчага працэсу (выбары мусяць успрымацца як добра арганізаваная ЦВК і мясцовымі ўладамі кампанія па фармаванні выбарчых камісій і рэгістрацыі кандыдатаў). Недзяржаўныя медыя, аперуючы ў межах адносна невялікіх аўдыторый, не маюць хоць якой істотнай магчымасці змяніць гэты фармат ды паспрыяць сапраўднай канкурэнтнай барацьбе паміж рознымі палітычнымі праграмамі кандыдатаў у дэпутаты.

Дадзеныя гэтага перыяду пацвярджаюць папярэднюю выснову адносна таго, што фармат асвятлення выбарчай кампаніі дзяржаўнымі медыя скіраваны на мінімізацыю палітычнай барацьбы паміж рознымі палітычнымі сіламі («ціхія выбары»), на няўдзел у гэтай барацьбе выбарцаў ды на маргіналізацыю альтэрнатыўных праграм (тым самым і альтэрнатыўных магчымасцяў) развіцця беларускага грамадства. Такі фармат асвятлення вядзе да добра вядомай з савецкіх часоў сітуацыі, калі значная колькасць выбарцаў робіць свой выбар на карысць таго ці іншага кандыдата ў дзень галасавання на падставе кароткай афіцыйнай інфармацыі, пададзенай выбарчай камісіяй.

# ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008

**БЕЛТА**

23.08-05.09.2008

## Адзінка вымярэння - колькасць знакаў






# ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008

## Белорусы и рынок

23.08-05.09.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.






## Брестский курьер

23.08-05.09.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.






ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008

## Першы нацыянальны канал, Панорама недели

23.09-05.09.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






## “Днепровская Неделя”

23.08-05.09.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**






# ПАРЛАМЕНЦКІЯ ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ 2008

## Euroradio

23.08-05.09.2008

### Адзінка вымярэння - колькасць знакаў






## Гомельскае абласное радыё 101.3 FM

23.08-05.09.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






## “Навіны рэгіёна” (Гомель), Першы нацыянальны канал

23.08-05.09.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






## Гомельская праўда

23.08-05.09.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.






## Комсомольская правда в Белоруссии

23.08-05.09.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**






## ТРК “Магілёў”/”Навіны”

23.08-05.09.2008

**Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)**






## ТРК "Магілёў" / "Новости-Регион"

23.08-05.09.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






## “Могилёвская Правда”

23.08-05.09.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.






**NAVINY.BY**
23.08-05.09.2008

**Адзінка вымярэння - колькасць знакаў**






## Агульнанацыянальнае тэлебачанне (ОНТ)

23.08-05.09.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






## Першы канал беларускага радыё, «Радыёфакт»

23.08-05.09.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






## Рэспубліка

23.08-05.09.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.






## “Беларусь сегодня”

23.08-05.09.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.






**TUT.BY**

23.08-05.09.2008

## Адзінка вымярэння - колькасць знакаў




